**УДК 908.00093(476.5)**

# НАТУРНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ПАДВАЛА І ПЕРШАГА ПАВЕРХА КОРПУСА «В» БЫЛОГА ЕЗУІЦКАГА КАЛЕГІУМА Ў ПОЛАЦКУ

***А.А. САЛАЎЁЎ***
***(Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік)***

*Прадстаўлены вынікі натурнага вывучэння першага паверха корпуса «В» былога Полацкага езуіцкага калегіума. Падчас яго мадэрнізацыі ў 2006 – 2008 гадах была сабрана вялікая калекцыя археалагічных матэрыялаў другой паловы XVIII – пачатку XIX стагоддзя, якія непасрэдна тычацца складанай будаўнічай гісторыі гэтага корпуса. На аснове сабраных матэрыялаў і натурных даследаванняў сцен і скляпенняў была праведзена спроба рэканструкцыі магчымага першапачатковага выгляду інтэр'ераў некаторых яго памяшканняў і печак, планіроўкі падвала і першага паверха.*

**Уводзіны.** Падчас мадэрнізацыі корпуса «В» у 2006 – 2008 гадах Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам (НПГКМЗ) праводзіліся натурныя даследаванні памяшканняў падвала і першага паверха будынка. Параўнанні існуючай планіроўкі, планаў 1828 года і планаў пачатку ХХ стагоддзя паказалі, што частка першапачатковых памяшканняў зараз цалкам страчана альбо значна перабудавана ў пачатку ХХ стагоддзя пры ўзвядзенні кацельні і афіцэрскай сталовай. Таксама вывучэнне найменш пашкоджаных пераробкамі ў XIX – ХХ стагоддзях памяшканняў падвала існуючага будынка і іх супастаўленне з планам 1828 года паказала, што апошні мае шэраг недакладнасцяў [1, с. 34, мал. 5]. Па гэтым плане немагчыма было адназначна вырашыць: быў першапачатковы падвал пад усім корпусам «В» ці з самага пачатку яго будаўніцтва знаходзіўся ў сучасных межах.

Падчас рамонту будынка ў 2006 годзе зноў узнікла пытанне наконт першапачатковых памераў падвала. Той, які існуе зараз, займае толькі цэнтральную, найбольш шырокую частку корпуса. Пра магчымае існаванне ізаляванай частцы сутарэнняў сведчылі выступаючыя муроўкі арак у папярочных сценах праезду ва ўнутраны дворык калегіума, а таксама шматлікія правалы ў бетонных падлогах першага паверха. За аснову натурных даследаванняў былі ўзяты планы падвала і першага паверха 1828 года; прывязка знаходак вялася да абмернага плана 2006 года (мал. 1). Нумерацыя памяшканняў умоўная. Таксама было шмат пытанняў і з першым паверхам, практычна ўсе сцены мелі шмат разнастайных закладак і пераробак, якія на першы погляд часам не мелі ніякай логікі і ўзаемасувязі паміж сабой. Трэба было высветліць іх уплыў на стан і трываласць сцен і скляпенняў, прычыны і час іх узнікнення.

**Асноўная частка.** Назіранні, праведзеныя ў свай час В.В. Глінікам і аўтарам гэтага артыкула (*А. С.*), паказалі, што ў структуры існуючага зараз корпуса знаходзяцца рэшткі больш стражытных будынкаў існаваўшых да яго ўзвядзення ў XVII – першай палове XVIII стагоддзя і загінуўшых падчас моцнага пажару. Ад іх ацалелі падвалы, падмуркі, рэшткі сцен і скляпення першага паверха. Гэтыя будынкі былі названы самімі езуітамі «сціплым калегіумам» і разглядаліся ў папярэднім артыкуле. Там яны праходзяць пад назвай «стары калегіум» [2, с. 72]. Гэта назва крыху пазней замацавалася і за ўсім корпусам «В» у процівагу новаму трохпавярховаму будынку – сучасным карпусам «А», «Б», «Г». Такім чынам, гэтая назва з'явілася сваеасаблівай памяццю аб старадаўніх мураваных пабудовах XVII – першай паловы XVIII стагоддзя. Менавіта неабходнасць іх уключэння ў структуру корпуса «В» вызначыла шэраг архітэктурна-канструктыўных і мастацка-дэкаратыўных асаблівасцяў і недарэчнасцяў існуючага зараз будынка. Частка матэрыялаў старых будынкаў была выкарыстана пры будаўніцтве сучасных карпусоў «Б» і «В». Так, напрыклад, са старадаўняй цэглы былі змураваны часткі сцен паміж калідорам і памяшканнямі № 8, 9 і 16 існуючага зараз корпуса сярэдзіны XVIII стагоддзя. У муроўцы некаторых частак вонкавых сцен падлогавыя пліткі ўжываліся для аконных перамычак памяшканняў № 7 – 10 і замка ў скляпенні памяшкання № 7. Частка іх была выкарыстаная і на падлозе памяшканняў № 9 і 10. Пячная кафля і дахоўка старажытных пабудоў – для засыпцы скляпенняў падвала і першага паверха. Пальчатка гэтых будынкаў адрознівалася ад цэглы корпуса «В» сярэдзіны XVIII стагоддзя. Яна мела іншы фармат і памеры, пераважна прадольныя барозны, часта штампаваныя. Таксама адрознівалася і рошчына пабудоў. Пальчатка корпуса «В» сярэдзіны XVIII стагоддзя аналагічна цэгле карпусоў «А» і «Г» і мае тры-чатыры касыя дыяганальныя барозны, пракрэсленыя пальцамі. Таксама знойдзены цагліны і іншага фармата, якія часам не мелі бараздаў, але іх няшмат і сустракаліся яны ў больш позніх пераробках і прыбудовах канца XVIII стагоддзя (мал. 2). У калекцыі будаўнічых матэрыялаў корпуса «В» выяўлены і лекальныя цагліны сярэдзіны XVIII стагоддзя. Яны ўжыты на яго фасадах і захаваліся на міжпавярховым карнізе і пілястрах. Па фармату лекальныя цагліны паўтаралі звычайныя вырабы, але мелі акруглыя ці ўвагнутыя тарцы. Гэтымі цаглінамі таксама была часткова выканана і адмостка, рэшткі якой прасочаны каля паўднёвай вонкавай сцяны памяшкання № 13.

Такія цагліны не мелі ніякай рошчыны. Унутры памяшканняў № 1 і 3 захаваўся цагляны карніз, ён утвараў выступ для мантажу апалубкі плафона і цыліндрычнага скляпення.



а)

б)

Мал. 1. Планы падвала (а) і першага паверха (б) перад рамонтам 2006 – 2008 гадоў.

Умоўныя знакі:

– існуючыя і выяўленыя муры «старога калегіума» (да сярэдзіны XVIII ст.);
– існуючыя і выяўленыя муры «старога калегіума» (да сярэдзіны XVIII ст.);
– існуючыя і выяўленыя муры кадэцкага корпуса і шпіталя (XIX – XX стст.);
– пераробкі розных часоў;
– мяркуемыя і страчаныя муры «старога калегіума» (да сярэдзіны XVIII ст.);
– мяркуемыя і страчаныя муры новага калегіума, корпуса «В» (сярэдзіна XVIII ст.);
– мяркуемыя і страчаныя муры кадэцкага корпуса і шпіталя (XIX – XX стст.);
– трубы, бэлькі;
– шурфы, занды;
– калодзежы і трубы пачатку XX стагоддзя

Назіранні паказалі, што лекальная цэгла мела ня столькі дэкаратыўнае, колькі канструктыўнае прызначэнне і ўжывалася пад тынкоўку, каб зручней было выцягваць вапнавыя профілі і рабіць нешырокі, але моцна выступаючы над паверняй сцяны карніз (мал. 3).




Мал. 2. Цэгла
і пліткі падлогі XVIII стагоддзя




Мал. 3. Вапнавыя карнізы сярэдзіны XVIII – XIX стагоддзяў:
а – па лекальнай цэгле;
б – з кавалкамі дахоўкі XVIII – XIX стагоддзяў

**Даследаванні падмуркаў і падвалаў.** Назіранні за падмуркамі і сценамі падвалаў дазволілі часткова высветліць іх канструкцыю. У заходняй частцы пад памяшканнямі № 1 – 5, 14, 20 корпуса «В» падвала не было, стратыграфія культурнага пласта пад памяшканнямі № 1 – 5 першага паверха паказала, што на яго месцы меўся вялікі склеп вышынёй да 1,2 м, дно якога было на глыбіні 1 – 1,2 м, гэта ўзровень магутнага пласта зямлі – культурнага слоя, перамешанага з мацерыковым пяском, суглінкам і глінай. Пры будаўніцтве гэтая зямля была выбрана з катлавана, а потым, пасля ўзвядзення падмуркаў, засыпана зноў. Таксама не было падвалаў і ва ўсходняй частцы – пад памяшканнямі № 11 – 13. Пад усходняй часткай калідора, верагодна, у сярэдзіне XVIII – пачатку XIX стагоддзя існавала патаемнае памяшканне падвала № 18, цалкам ізаляванае ад іншых. Дзеля гэтага пад усходнімі дзвярамі калідора была зроблена цагляная лесвіца, якая вяла пад зямлю. З двух бакоў яна была агароджана сценкамі ў палову цагліны. Пазней, у канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя, лесвіца разам з памяшканнем была ліквідавана, а ўваход замураваны. Пасля гэтага і была ўзведзена адмостка з лекальнай цэглы-пальчаткі перад памяшканнем № 13. Галоўнымі нясучымі элементамі падмурка з’яўляліся прадольныя ўнутраныя сцены. Папярочныя падмуркі былі часткова заменены шырокімі разгрузачнымі аркамі. Магутныя паўцыркульныя аркі шырынёй 3,0 – 4,0 м мелі таўшчыню ў 1,5 – 2,0 цагліны (каля 0,45 – 0,6 м). Такім чынам, з улікам падэшвы і падвалаў глыбіня падмуркаў корпуса была каля 3,5 – 4,0 м ад сучаснай дзённай паверхні. Яны былі разлічаны такім чынам, каб цалкам прарэзаць культурны пласт, мацерыковы пясок, суглінак і дасягнуць магутнага пласта чырвонай гліны, на якую падшэвамі абапіраўся падмурак і, магчыма, быў часткова заглыблены ў яе. Вонкавыя і знешнія сцены падвалаў мелі змяшаную муроўку сцен і тычковую скляпенняў [3, с. 90]. Украпленні камянёў былі бачныя ў памяшканнях № 6 – 8. На паўночным вонкавым фасадзе звычайна 4 – 5 радоў цэглы падзяляліся радамі камянёў.

Падлогі ў сутарэнні першапачаткова былі землянымі, таму падчас рамонту 1831 года быў зняты «верхний нечистый слой земли» [1, с. 16] і зроблена каменная брукоўка. Зараз у памяшканні № 6 бачны вялікія камяні падмуркаў сцен. Выкладзеная каменем падлога, як і ў карпусах «А», «Б», «Г», верагодна, знаходзіцца пад слоем бетона і была зафіксавана падчас даследаванняў толькі ў памяшканні № 24. З гэтага памяшкання пачынаецца падземны пераход для труб цеплатрасы з кацельні, ён злучаў раней узарванае трохпавярховае ўсходняе крыло новага калегіума і кацельню. Пераход уяўляе сабой скляпеністы бетонны тунэль з глінянай вязкай падлогай, які пачынаўся ніжэй падмуркаў корпуса «В». Падчас яго рыцця частка зямлі была пакінута ў памяшканні № 24 і схавала каменную падлогу.

Верагодна, што пасля пабудовы ў сярэдзіне XVIII стагоддзя існуючага зараз падвала корпуса ён быў падзелены на дзве часткі, першапачаткова не звязаныя паміж сабой. Усходнія памяшканні падвала № 9, 10, 15, 17, 18, 24 ацалелі ад больш ранніх пабудоў XVII – першай паловы XVIII стагоддзя. Заходняя частка падвала (памяшканні № 6, 7, 8, 17) была новай. Кожная з частак мела самастойны ўваход, які неаднаразова пераносіўся. Так, рэшткі цагляных сценак лесвіцы знойдзены каля замураванага зараз акна памяшкання № 10, таўшчыня іх была ў 1 ці 2 цагліны-пальчаткі. Лесвіца спускалася ўздоўж фасада будынка, але яе расчыстка не вялася. Заходняя частка падвала ў розныя часы мела ўваходы з памяшканняў № 6 і 7. Даследаванне фасада каля памяшкання № 6 дазволіла знайсці арку першапачатковага дзвярнога праёма сярэдзіны XVIII стагоддзя. Яго першапачатковы ўсходні адхон, магчыма, ацалеў і схаваны пад адхонам XIX – пачатку XX стагоддзя. Заходні адхон быў цалкам знішчаны. Падмурак у гэтым месцы моцна пашкоджаны пры будаўніцтве ў апошняй чвэрці XVIII стагоддзя прыбудовы, якая, верагодна, зафіксавана на плане 1828 года. Фармат яе цэглы 30 – 33 × 15 × 7 – 7,5 см. Сцены прыбудовы захаваліся вельмі дрэнна, да таго ж былі пашкоджаны экскаватарам падчас будаўнічых работ. Падмуркі сцен – на розных узроўнях. У заходняй сцяны падмурак у выглядзе каменнай вымасткі. Сама сцяна на адлегласці каля 2,0 м паварочвае на паўночны захад і далей разбурана. Яна прасочана на даўжыню каля 2,8 м, рэшткі яе муроўкі – на глыбіні 1,2 м, узровень падэшвы сцяны – на глыбіні 1,4 м, пад ёй – чорны культурны пласт.

Падмурак усходняй сцяны больш глыбокі і трывалы, ён прасочаны на глыбіні 1,4 м і са сцяной корпуса не звязаны. Падмурак ішоў паралельна заходняй сцяне і з самага пачатку меў паўночна-заходні накірунак. Але сама сцяна была пастаўлена перпендыкулярна будынку, яе даўжыня складала каля 2,6 м. Рэшткі гэтай сцяны зафіксаваны на глыбіні 0,5 – 0,8 м. Каля самога будынка яна мела невялікую нішу памерам 0,3 × 0,67 см, паміж ёй і ўваходам у падвал сцяна корпуса мела сляды рамонту і яе муроўка выступала на палову цагліны-пальчаткі. У ніжняй частцы сцяна корпуса была дадаткова ўмацавана цаглянай муроўкай, пакладзенай на гліняным замку шырынёй каля 2,0 м.

У XIX стагоддзі ўваход у падвал быў з боку памяшкання № 7. Верагодна, ён быў уладкаваны пры кадэтах, бо муроўкі адхонаў праёма і рэшткі лесвіцы зроблены з малафарматнай цэглы. На плане 1828 года ў гэтым памяшканні таксама была прыбудова.

**Даследаванні першага паверха.** У памяшканнях № 1 – 3 першага паверха першапачатковыя нішы сярэдзіны XVIII стагоддзя замураваны. Былі замураваны і некаторыя першапачатковыя дзверы. Гэтыя работы часткова былі праведзены ў XIX стагоддзі пры піярах і кадэтах, а некаторыя і зараз. Так, паміж

памяшканнямі № 1 і 2 быў замураваны высокі дзвярны праём, які неаднаразова перарабляўся. Побач з ім, каля брамы, мелася неглыбокая замураваная ніша ў палову цагліны. Назіранні паказалі, што зараз праёмы брамаў, іх аркі пашыраны і таму страцілі першапачатковыя абрысы, іх адхоны, асабліва ўнізу, маюць сляды рамонтаў часоў кадэтаў і піяраў. Страчаны і першапачатковы ўзровень праезду і брукоўкі, у параўнанні з сучаснай яна была вышэй на 0,5 – 0,6 м у выніку паглыблення праезду, зробленага пры валоданні будынкамі ваенным шпіталем. У выніку гэтых рамонтаў цалкам была знесена старажытная брукоўка і таму агаліліся разгрузачныя старажытныя аркі папярочных сцен. Паміж памяшканнямі № 2 і 3 у нішах сцяны зроблены два дзвярных праёмы (зафіксаваны на плане 1828 года), а пры кадэтах закладзены. Першапачатковы дзвярны праём сярэдзіны XVIII стагоддзя быў зафіксаваны і паміж памяшканнямі № 3 і 4, пазней ён быў перароблены ў дымаходы, яго арка была пашкоджана з боку памяшкання № 4. Цаглянага карніза над ім не выяўлена, бо ўладкаваць карніз замінала цагляная перамычка праёма, замест гэтага для вапнавага карніза пры будаўніцтве ў сярэдзіне XVIII стагоддзя былі ўсталяваны жалезныя штыры. Сучасны дзвярны праём у памяшканне № 3 уладкаваны ў пачатку XX стагоддзя на месцы пячнога праёма. Рэшткаў печаў у памяшканнях № 1 і 3 не знойдзена, бо ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя іх падлога была выбрана на глыбіню каля 1,0 м. У памяшканні № 3 гэтая падлога была пліткавая, пліткі былі каляровымі, цэментнымі. Пры яе расчыстцы сустрэты кавалкі штампаванай кафлі фабрычнай вытворчасці, дзверцы ад паддувала печы пачатку XX стагоддзя.

Памяшканне № 4 першачаткова ўяўляла сабой невялікую скляпеністую залу. На плане 1828 года гэта зала мела два слупы, ссунутыя бліжэй да яе паўднёвай сцяны, і ўваход з боку калідора. Даследаванні памяшкання паказалі, што гэты ўваход прабіты ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя на месцы замураванай першапчатковай шырокай нішы. На ўсход ад яе таксама была падобная ёй ніша, але больш нізкая. Усходняя сцяна памяшкання практычна не захавалася, толькі па краях прасочаны яе невялікія фрагменты, выкарыстаныя ў якасці пілонаў для падтрымцы рэшткаў скляпенняў і металічных бэлек бетонных перакрыццяў пачатку XX стагоддзя. Аналіз яе рэшткаў і плана 1828 года паказаў, што сцяна мела дзвярны праём і невысокую скразную арку, якія вялі ў наступнае памяшканне № 5. На ацалелых першапачатковых сценах прасочаны абрысы знесеных крыжовых скляпенняў XVIII стагоддзя. Пад асфальтабетоннай падлогай прасочаны рэшткі слупоў, якія трымалі скляпенне. Яны знаходзіліся на цэнтральнай восі памяшкання. Найбольш моцны з іх знаходзіўся ў цэнтры, ён быў шырынёй каля 1,2 м. На яго прыходзіўся асноўны цяжар столі. Другі, больш вузкі, размяшчаўся бліжэй да паўднёвай сцяны залы. Падмурак слупоў уяўляў сабой цагляную муроўку, якая была прасочана да глыбіні 1,2 м ад бетоннай падлогі, далей яна змянялася каменнай і, магчыма, звужалася. Падобная апорная сістэма скляпенняў была выклікана неабходнасцю будаўніцтва сцяны памяшканняў другога паверха, якая была змешчана на поўнач паралельна сцяне калідора першага паверха. Яна была пастаўлена на самае трывалае месца крыжовага скляпення першага паверха – цэнтральную вось, умацаваную рэбрамі жорсткасці [4, с. 56, 75, мал. 1 і 2]. Для гэтага і быў узведзены дадатковы апорны слуп. Адлегласць ад яго да паўднёвай сцяны будаўнікі павінны былі разлічыць такім чынам, каб рэбры жорсткасці знаходзілася пад воссю запланаванай сцяны. Таксама трываласць канструцыі ўзмацнялася і стромкімі абрысамі скляпення (мал. 4). Першапачаткова ў памяшканні была печ. Але існавала яна вельмі нядоўга і ўжо на плане 1828 года яе няма. Печ знаходзілася паміж двума слупамі. Быў прасочаны падмурак яе паўночнай сцяны, які захаваўся на вышыню аднаго рада цэглы. Ад падмурка паўднёвай сцяны печы ацалелі толькі невялікія камяні. Глыбіня залягання падэшвы падмурка печы каля 1,2 м ад сучаснай бетоннай падлогі, які не быў звязаны з падмуркамі слупоў. Першапачаткова падмурак меў выгляд вялікай паўцыркульнай аркі, пастаўлены на перамешаны культурны пласт, які запаўняў катлаван корпуса. Вусце топкі печы, верагодна, было з паўднёвага боку і «глядзела» ў нішу паўднёвай сцяны залы. Печ размяшчалася такім чынам, што абагравала памяшканне ўсімі чатырма сценкамі і ўяўляла сабой сіметрычнае цаглянае збудаванне, якое завяршалася канічным дахам. Дымаход вёў праз адтуліну скляпення і пад падлогай першага паверха ў тоўшчу сцяны другога паверха, якая была пастаўлена на рэбры жорсткасці. Рэшткі падмуркаў печы перакрываў магутны пласт бітай кафлі сярэдзіны XVIII стагоддзя і абпаленай гліны. Сценавы кафель меў памеры каля 34 × 20,5 × 8,5 см і глыбокія прафіляваныя нішы, частка вырабаў пакрыта карычневай палівай з жоўтымі плямкамі. Кутнія сценавыя кафліны былі двухчасткавымі. Карнізы прадстаўлены гладкімі, прафіляванымі вырабамі трох відаў. Самыя вялікія з іх, верагодна, былі ў ніжняй частцы печы, іх памеры 42 × 21,5 × 16,0 см. Унутры яны мелі



Мал. 4. Рэканструкцыя інтэр’ера сярэдзіны XVIII ст. паўднёвай часткі памяшкання № 4

дадатковую цагляную перагародку з боку вусця румпы. Падобныя кафлі было зручна запаўняць глінай, а дзякуючы даўжыні яны прадухілялі дэфармацыю і ўсадку кафлянай «вопраткі» печы. Таксама сустрэты карнізы 22 × 13 × 13,5 і 21,0 м × 10,5 14,5 см. Магчыма, пасля будаўніцтва другога паверха яна была перакладзена і прыстасавана да ацяплення падлогаў. Пасля гэтага печ, верагодна, праіснавала нядоўга, з прычыны нетрываласці грунтоў. Пачаліся дэфармацыі аркавага падмурка. З'явіліся трэшчыны на сценах самой печы і ў месцы яе злучэння са скляпеннем памяшкання. Да 1828 года печ была цалкам разабрана, аб чым сведчыць тое, што непашкоджаныя кафля і цэгла былі старанна выбраны. Пасля гэтага прастора пад драўлянай падлогай залы была часткова засыпана, а печ, верагодна, перанесена да ўсходняй сцяны памяшкання, але таксама праіснаваля нядоўга, яе кафлі па канструкцыі набліжаны да вырабаў машыннай вытворчасці XIX – XX стагоддзяў, падмуркаў ад яе знайсці не ўдалося, але сустрэта цікавая карнізная кафля з надпісам на адвароце.

Назіранні паказалі, што памяшканне мела вялікі склеп пад падлогай. Ён пазней быў ліквідаваны. Аб існаванні першапачатковай драўлянай падлогі сведчаць адсутнасць гліняных плітак, значная глыбіня рэшткаў першапачатковай печы, выступы сцен і характар стратыграфіі шурфоў. На значнай глыбіне (0,5 – 0,6 м) была знойдзена малафарматная цэгла XIX – пачатку XX стагоддзя.

Пасля таго як знеслі першапачатковы інтэр'ер памяшкання № 4, падлога яго (некаторы час) была выканана з каляровых штампаваных плітак, аналагі якіх вядомы ў надбудове корпуса «А» [4, с. 58: мал. 1, с. 79 – 80: фота 9 і 10], а пазней – з пафарбаванага ў чырвоны колер бетону.

Даследаванні наступнага памяшкання паказалі, што ў сярэдзіне XVIII стагоддзя яно таксама было скляпеністым. Магчыма, што раней памяшканне № 5 злучалася з калідорам. Акрамя паўночнай сцяны, усе астатнія маюць значныя пашкоджанні ці цалкам знішчаны. Па плану 1828 года яно не мела печы і злучалася з памяшканнем № 4. Даследаванні прасторы пад падлогай таксама не дазволілі знайсці і зафіксаваць рэшткаў печы ў гэтым памяшканні, але было высветлена, што пад ім быў скляпеністы тунэль – каналізацыя, якая вяла з былой квасной і пекарні ў бок вала Івана Грознага. Яшчэ ў 2003 годзе падчас капання шурфоў ва ўнутраным двары калегіума археолагам С.В. Тарасавым на невялікай глыбіне быў знойдзены замураваны аркавы праём з убудаванай керамічнай дрэнажнай трубой пачатку XX стагоддзя. Мяркуючы па памерам, гэты праём мог быць першапачатковым уваходам для прачысткі тунэля. Праз пралом у памяшканні падвала № 15 было высветлена, што пад будынкам корпуса вышыня тунэля была каля 1,0 – 1,2 м (мал. 5).




Мал. 5. Выгляд скляпення каналізацыйнага тунэля і арак-перамычак
для лесвіцы сярэдзіны XVIII стагоддзя на другі паверх у шурфе калідора

Функцыянаваў тунэль да пачатку XX стагоддзя. Так, пры кадэтах на месцы яго стыку з паўночнай сцяной корпуса меў месца лаз у выглядзе неглыбокага калодзежа с драўлянай накрыўкай. Далей, пад брукоўкай двара, скляпенне тунэля значна ніжэйшае, па ім можна было толькі прапаўзці на карачках. Яго сценкі і скляпенне каля корпуса «В» былі перакладзены і выкананы з малафарматнай цэглы каля 27 × 13,7 × 6 см з літарамі «СТ» ці «С.» «Т.». Падобная цэгла выраблялася пры струньскай турме [5, с. 178]. Пры гэтым першапачатковы накірунак тунэля ў двары быў крыху зменены. У пачатку XX стагоддзя яго скляпенне часткова было разбурана, па ім пракладзена цэментна-керамічная каналізацыя сучаснага ўзору [6, с. 53]. У паўночнай частцы тунэля бачны сляды рамонту.

Таксама было вельмі пашкоджана і памяшканне № 6. Некалі яно было перакрыта цыліндрычным скляпеннем у палову цэглы. Ва ўсходняй яго сцяне была глыбокая ніша – падрыхтаваны на перспектыву праём для ўвахода ў суседняе памяшканне № 7, невялікі тамбур-уваход з паўночнага боку. Яно мела і

шырокі ўваход з калідора. Па плану 1828 года гэты пакой ацяпляўся прамавугольнай выцягнутай ў плане печчу, для якой з калідора быў прадугледжаны вялікі праём. Знешні выгляд і канструкцыя гэтай печы, паказанай на плане 1828 года, аналагічны печам келляў карпусоў «А» і «Г» [4, с. 55, 58]. Пазней, у канцы XVIII – XIX стагоддзяў, гэты праём быў часткова замураваны і паменшаны. Даследаванні паказалі, што рэшткаў самой печы не захавалася, на яе месцы з сутарэння падвала ў XIX стагоддзі быў зроблены дымаход, каля акна памяшкання – глыбокая вялікая ніша. У пачатку XX стагоддзя памяшканне набыло бетонную столь і пліткавую падлогу, аналагі якой вядомы ў надбудове корпуса «А» [4, с. 58]. У XX стагоддзі памяшканні № 6 – 10 былі злучаны амфіладай – прабітымі ў бакавых сценах невялікімі праёмамі, якія не мелі ніякіх перамычак, што прывяло да ўзнікнення трэшчын у скляпеннях.

Далей, на ўсход ад яго знаходзіўся невялікі калідор (тамбур), першапачаткова гэта быў уваход, але пазней дзверы пераробілі ў акно. Па планам 1828 года і пачатку XX стагоддзя гэта памяшканне з калідорам злучана не было – вынік шматлікіх рамонтаў. Першапачаткова памяшканне № 7 не мела і паўднёвай сцяны, ў галоўны калідор вяла шырокая арка. Пасля зносу перагародкі канца XVIII – пачатку XX стагоддзя прасочваюцца рэшткі пабеленай тынкоўкі сярэдзіны XVIII стагоддзя з нагарам. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя вышыня дзвярнога праёма, які вёў з вуліцы, неаднаразова мянялася. Некаторы час ён знаходзіўся каля самай зямлі і таму была зроблена бетонная наборная лесвіца. Пазней яна была замураваная. Таксама ў XIX стагоддзі перакладзена, у палову цагліны, і паўночная частка скляпення. Некаторы час яно мела адну ці дзве невялікія печы, пазначаныя на плане пачатку XX стагоддзя.

Памяшканні № 8 і 9 мелі аднолькавую першапачатковую планіроўку. Акно і дзверы знаходзіліся ў супрацьлеглых сценах, каля акна была глыбокая ніша. Дзвярны праём памяшкання № 9 больш вузкі, бо захаваўся ў фрагменце сцяны ад больш старажытнага цаглянага будынка апошняй трэці XVII – першай паловы XVIII стагоддзя, які папярэднічаў узвядзенню корпуса «В». Пазней ён быў пашыраны. Побач з ім захаваўся падмурак квадратнай печы таго ж часу [2, с. 76], затым у сярэдзіне XVIII стагоддзя ён быў часткова дабудаваны з поўначы для ўладкавання першапачатковай печы корпуса «В». Абодва памяшканні перакрывалі цыліндрычныя скляпенні ў палову цагліны.

Падлога памяшкання № 9 першапачаткова была выканана з плітак, знятых у памяшканнях старажытнага будынка, які быў на месцы цяперашняга корпуса «В». Але яны таксама былі пашкоджаны пажарам. Клалася падлога на пяшчана-гліністую падсыпку абгарэлым бокам уніз. У памяшканні № 8 падлога XVIII стагоддзя была першапачаткова, магчыма, драўлянай. Згодна плану 1828 года памяшканні № 8 і 9 мелі прамавугольныя выцягнутыя ў плане печы, для якіх з калідора прадугледжваліся невялікія пячныя праёмы. Паздней, у апошняй чвэрці XVIII стагоддзя, печ у памяшканні № 8 была абкладзена гладкай блакітнай кафляй, кавалкі якой сустрэты пад падлогай. Па канструкцыі гэтыя печы паўтаралі сінхронныя печы карпусоў «А» і «Г» [4, с. 55].

На сцяне паміж гэтымі памяшканнямі ёсць рэшткі замураванага праёма невядомага прызначэння і пашкоджанай першапачатковай муроўкі. Гэта сведчыць пра шматлікія перабудовы печаў. У гэты час пячныя праёмы былі замураваны.

Пячны праём з памяшкання № 8 паўтараў памеры праёма памяшкання № 6, пасля яго частковага змянення. Пячны праём з памяшкання № 9 не захаваўся, на яго месцы быў зроблены калодзеж у падвал. Цалкам, магчыма, што для першапачатковай печы сярэдзіны XVIII стагоддзя быў выкарыстаны праём, захаваны ў фрагменце сцяны старажытнага будынка апошняй чвэрці XVII – першай паловы XVIII стагоддзя. Таксама пад падлогай памяшкання № 8 пад падмуркам печы знойдзены рэшткі заходняй вонкавай сцяны апошняй чвэрці XVII – першай паловы XVIII стагоддзя.

Памяшканне № 10, меншае за іншыя, першапачаткова ў сярэдзіне XVIII стагоддзя было цалкам ізалявана ад першага паверха. Яно мела асобны ўваход з вуліцы ў выглядзе шырокай аркі ці дзверы з аркавай зашклёнай фрамугай. Але гэтыя версіі патрабуюць дадатковых даследаванняў. Паўднёвая частка скляпення памяшкання неаднаразова рамантавалася і перараблялася. У скляпенні прасочаны рэшткі прабітай цаглянай сцяны і дымахода. Даследаванні паўднёвай сцяны памяшкання № 10 паказалі прысутнасць рэшткаў увахода ў падвал старажытнага будынка апошняй чвэрці XVII – першай паловы XVIII стагоддзя. У сярэдзіне XVIII стагоддзя на яго месцы збоку калідора быў уладкаваны пячны праём з пліткавай адмосткай. Пазней, у канцы XVIII – XIX стагоддзі, у тоўшчы гэтай сцяны былі зроблены вінтавыя дымаходы, якія, на нашу думку, належалі да позніх печаў памяшканняў № 10 і 11, сам жа пячны праём, магчыма, быў перароблены ў топку. Паўднёвая частка скляпення перакладзена ў форме плафона пры ўладкаванні «цёплай падлогі» другога паверха ў канцы XVIII стагоддзя. Усходняя і паўднёвая сцены памяшкання № 10 пашкоджаны шматлікімі пераробкамі ў XIX – XX стагоддзях. Верагодна, у той жа час яно набыло вапнавы карніз, таўшчыня тынку на ўзроўні пятак сакляпення дасягала больш за 10 см. У якасці напаўняльніка ў тынкоўку было дабаўлена шмат кавалкаў дахоўкі, некаторыя з іх буйныя. Пад бетоннай падлогай захаваліся рэшткі старадаўняй лесвіцы будынка апошняй чвэрці XVII – першай паловы XVIII стагоддзя [2, с. 73], які знаходзіўся тут да ўзвядзення корпуса «В». Пазней яна была пашкоджана вентыляцыйным тунэлем XIX стагоддзя. Падлога гэтага памяшкання першапачаткова таксама некалі была пліткавай на пяшчана-гліністай аснове.

Унутраныя сцены памяшканняў № 9 і 10 былі пастаўлены на рэшткі старажытных сцен XVII – XVIII стагоддзяў, якія мелі большую таўшчыню. Памяшканні № 10 і 11 у XIX – пачатку XX стагоддзя былі злучаны некалькімі праёмамі, якія неаднаразова закладвалі ці, наадварот, прабівалі. Тут у гэты час была збудаваная і кафляная праёмная печ, уся кафля якой была гладкай машыннай вытворчасці. Пячны набор уключаў у сябе некалькі відаў кафлі – карнізных, сценавых, паясковых, перамычак, цокальных. Усе вырабы з белай эмалі, гладкія. Гэтая кафля, мяркуючы па кляйму, была зроблена ў Віцебску на мануфактуры Ерамея Гарбуза. У плане печ была набліжана да квадрату каля 1,1 × 1,1 м.

Памяшканні № 11 і 13 першапачаткова меркаваліся цалкам з сіметрычнай планіроўкай. Яны былі перакрыты крыжовымі скляпеннямі, мелі па тры акны. У супрацьлеглых сценах знаходзіліся дзверы з сеняў. Побач з імі, ў памяшканні № 12 былі высокія нішы, з прабітымі вокнамі ў сені, па гістарычнай даведцы [1, с. 12]. З супрацьлеглага боку ад дзвярэй былі запланаваны кафляныя печы. Для гэтага ў сценах зроблены дымаходы і пячныя праёмы. У паўночнай сцяне памяшканняў № 11 і 13 змураваны шырокія і глыбокія нішы для печаў. Пазней, падчас будаўніцтва памяшкання № 11, у першапачатковы праект былі ўнесены змены і печ каля дзвярэй вырашылі не будаваць. Аб гэтым сведчыць як адсутнасць рэштак яе падмуркаў, так і некранутая сцяна і падлога пабудовы XVII – першай паловы XVIII стагоддзя. Пячны праём быў закладзены і ў памяшканні, магчыма, была зроблена пліта ці вогнішча. Каля саміх дзвярэй быў дадатковы дымаход з лучковай аркай, побач з ёй – счасаныя цагліны сценак. Яны таксама маглі належаць да невялікай пліты. У XIX – пачатку XX стагоддзя сцены ў гэтай частцы памяшкання неаднаразова перакладаліся – было прабіта акно на месцы нішы, зроблены новыя дымоходы, частка якіх – гарызантальныя, па канструкцыі яны нагадвалі «цёплыя падлогі». Гэтыя дымаходы былі ва ўсходняй сцяне памяшкання на месцы першапачатковага пячнога праёма. Магчыма, яны маглі быць збудаваны пасля пераўтварэння ў пачатку XX стагоддзя памяшкання № 12 у праезд ва ўнутраны дворык. Гэта было выклікана будаўніцтвам кацельні і афіцэрскай сталовай. Печ, магчыма, была перанесена да заходняй сцяны памяшкання № 11 (паказана на плане 1828 г.). Ніякіх матэрыялаў аб яе канструкцыі і вонкавым выглядзе не захавалася. Пазней у гэтай сцяне неаднаразова ўладкоўваліся ўваходы ў памяшканне № 10.

Падлогі памяшканняў № 11 і 13 спачатку былі з масіўных цэглападобных плітак з касымі барознамі на адвароце. Падобную падлогу мела і памяшканне № 12. Магчыма, што перад уваходам з поўначы і пячным праёмам узровень часткі падлогі быў на палову метра ніжэй за астатнюю, каб мець зручны доступ да топкі печы. Такім чынам яна ўяўляла сабой невялікую пляцоўку і 2 – 3 цагляныя прыступкі. Усходняя і заходняя сцены памяшкання № 12 першапачаткова планаваліся сіметрычнымі, але пазней пячны праём памяшкання № 11 быў закладзены. Паўднёвая сцяна, магчыма, мела акно ці дзверы ва ўнутраны дворык. У паўднёвай частцы памяшкання першапачаткова была вінтавая драўляная лесвіца ў мансарду. Для гэтага ў скляпенні быў запланаваны квадратны лаз 2,5 × 2,5 м.

Памяшканне № 13 было злучана з трохпавярховым будынкам. З абодвух бакоў увахода ў гэты будынак ва ўсходняй сцяне былі дзве глыбокія нішы. Пазней, у апошняй чвэрці XVIII стагоддзя, у гэтым памяшканні зрабілі «цёплую падлогу», якая некалькі разоў рэканструявалася. Ее каналы часта перабудоўваліся: іх рабілі то ў памяшканні № 13, і яны мелі перагародку ў палову цагліны, то яны ацяплялі і сумежнае памяшканне ў трохпавярховай частцы будынка. Каналы размяшчаліся ўздоўж сцен. Былі таксама перабудаваны пячны праём і сама печ для падагрэву падлогі. Тая частка каналаў, што выходзіла з печы, падзялялася перагародкай таўшчыней у палову цэглы, далей каналы былі на вымастцы з бітай цэглы на гліне і падзяляліся перагародкамі з пастаўленай на рабро цэглы. Цяпер гэта печ – збудаванне з двюма топкамі: ніжняя – для падлогі першага паверха; верхняя – для другога паверха. Каля пячнога праёма быў пабелены цагляны кораб, у якім знаходзіўся дымаход, надпадлогавая частка печы была цалкам цаглянай. Знешне печ, верагодна, практычна не адрознівалася ад звычайнай. Але яе база і надстаўка, абкладзеныя кафляй, былі аднолькавай вышыні. Завяршалася печ канічным цагляным шатром, пабеленым крэйдай. Кафля, з якой была збудавана гэта печ, прадстаўлена прафіляванымі карнізамі двух відаў і сценавымі – з медальёнамі складанай канфігурацыі і кветкамі па кутах (мал. 6), гэтым яна паўтарала печ з памяшкання № 9 першага паверха корпуса «А». Пазней, пры піярах, да 1828 года «цёплая падлога» была знесена і на месцы адной з нішаў каля акна ўладкавалі цагляную лесвіцу з перагародкай, якая падзяляла памяшканне № 13 на дзве часткі. На месцы разглядаемай печы была збудавана меншая, праёмная печ, яе падмурак перакрыў рэшткі першай.

Цэнтральную частку будынка корпуса «В» займаў скляпеністы калідор. Як і ўсе памяшканні XVIII стагоддзя, ён быў пабелены. У яго выходзілі пячныя праёмы і дзверы некаторых памяшканняў (мал. 7).

У паўночнай сцяне была высокая арка тамбура паўночнага ўвахода. Можна меркаваць, што скляпенне калідора складалася з трох частак, падзеленых цяглянымі лесвіцамі. Усходняя і заходняя часткі былі цыліндрычнымі і маглі мець дадатковае ўмацаванне падпружнымі аркамі. Усходняя частка скляпення захавана ад больш старажытнага цаглянага будынка. Сярэдняя, найвялікшая, частка скляпення мела вялікія распалубкі пад арку тамбура ці было крыжовым над месцам яе знаходжання.

Пад лесвіцы, ніжэй узроўня падлогі калідора, былі ўзведзены магутныя лучковыя аркі-перамычкі, пад якія яшчэ пры ўзвядзенні сцен падрыхтоўваліся цагляныя выступы. Муроўка арак і сцен над імі – тычковая, бо яна найбольш трывалая. Самі лесвіцы таксама мелі выгляд арак у чвэрць круга. Ніжнім канцом яны абапіраліся на арку-перамычку, верхнім – у скляпенне. Лесвіца падобнай канструкцыі захавалася зараз у былым доме віцэ-губернатара. Цалкам магчыма, што ў месцы стыкаў лесвіц і скляпенняў знаходзіліся перагародкі з праёмамі.




а) б) в)

Мал. 6. Печ канца XVIII стагоддзя ў памяшканні № 13:
рэканструкцыя разрэза (а) і знешняга выгляду паўднёвага (б) і ўсходняга (в) фасадаў




Мал. 7. Пячны праём (памяшканне № 6) сярэдзіны XVIII стагоддзя са слядамі пераробак у XVIII – XIX стагоддзях

Падчас рамонту 1831 года ступені лесвіц былі пакрыты чыгуннымі прыступкам з геаметрычным плоскарэльефным арнаментам. Падобнае пакрыццё набылі і пляцоўкі перад імі. Гэта былі пліты каля 0,78 × 0,78 м, якія кламіся «унахлёст» адна на адну. Падчас іх уладкавання муроўку сценаў крыху пашкодзілі склюдаваннем.

У сярэдзіне калідора Таксама, мелася лесвіца, якая вяла ў падвал. Яна пазначана на плане 1828 года і, магчыма, знаходзілася паміж памяшканнямі падвала № 16 і 17. У тым месцы і зараз сцяна паміж памяшканнямі падвала дасягае таўшчыні каля 3,0 м. Там размяшчаюцца паралельна дзве сцяны розных часоў: апошняй чвэрці XVII – першай паловы XVIII стагоддзя і сярэдзіны XVIII стагоддзя.

Назіранні ў падвале паказалі, што рэшткі гэтай лесвіцы былі знішчаны ў пачатку XX стагоддзя шматлікімі пераробкамі, адна з іх прывяла да з'яўлення атынкаванага перахода паміж памяшканнямі. Акон у калідоры не было. Магчыма ён асвятляўся праз фрамугі дзвярэй у тарцах калідора і тамбура (памяшканне № 7). Падлога ў калідоры першапачаткова магла быць пліткавай. У пачатку XX стагоддзя цэнтральная частка паўднёвай сцяны калідора была знішчана пры будаўніцтве кацельні і афіцэрскай сталовай, куды вялі двое высокіх дзвярэй. Паколькі новая сцяна была збудавана пад вуглом да першапачатковай, каб стварыць парамавугольную залу сталовай, калідор набыў бачныя зараз крывалінейныя абрысы. Крыху пазней, каб схаваць гэтую крывізну, побач з выступам паўднёвай сцяны была ўзведзена бетонная перагародка, а столь аздоблена прафіляванымі цягамі. У гэты ж час падлога калідора аздабляецца каляровай штампаванай квадратнай пліткай.

Памяшканне № 14 першапачаткова з'яўлялася пекарняй і квасной і было перакрыта крыжовым скляпеннем, якое абапіралася на квадратны слуп. Гэта памяшканне першапачаткова з калідорам не злучалася, уваход знаходзіўся ва ўсходняй сцяне, праз квасную, яго сцены і столь былі пабелены. Памяшканне № 14 спачатку мела 4 акны. Пякарская печ займала чвэрць памяшкання, яго паўночна-ўсходні кут і была практычна не бачнай за слупом. Яе галоўны, заходні, фасад, верагодна, быў кафляным. Пад печчу пазней зробілі невялікі склеп з цаглянай падлогай. Пад аркай яе падмурка з квасной быў лаз. Там жа праз склеп праходзіў каналізацыйны скляпеністы тунэль, у які быў уваход пад акном з поўдня. Адыходы вытворчасці зліваліся ў адтуліны праз скляпенне. Сцёк выводзіў за паўночную сцяну будынка, праходзіў пад гаспадарчымі цаглянымі пабудовамі і, верагодна, вёў у роў перад валам Івана Грознага. Гэты тунэль

падзяляў падземную частку будынка на дзве часткі. Падлога памяшкання была пліткава-цаглянай на пяшчанай падсыпцы (мал. 8). Пазней, у канцы XVIII – XIX стагоддзя, каля печы на месцы нішы былі прабіты дзверы з калідора і, магчыма, перакладзена падлога, перыядычна мяналася размяшчэнне акон.




Мал. 8. Прасеўшая цагляна-пліткавая падлога пякарні XVIII стагоддзя. Шурф у памяшканні 14

Пры кадэтах на месцы пякарскай печы былі збудаваны дзве малыя.У забутоўцы яе падмурка сустрэты цагліны, якія можна лічыць пераходным вырыянатам паміж страдаўняй буйнафарматнай пальчаткай і малафарматнай цэглай XIX стагоддзя. Знойдзеныя цагліны мелі даўжыню 27 – 28 см, сячэнне 12,5 – 13,5 × 6 см. У пачатку XX стагоддзя інтэр’ер пякарні быў цалкам знесены.

Далей на ўсход ад пякарні былі 5 аднолькавых скляпеністых памяшканняў. Планам і інтэр’ерам яны падобныя на памяшканні № 6, 8 і 9, але больш вузкія. У пачатку XX стагоддзя гэтыя памяшканні амаль цалкам знесены. На іх месцы збудаваны вялікія памяшканні № 15 і 16.

У паўднёва-ўсходняй частцы памяшкання № 16 ацалелі фрагменты муровак старажытнага будынка XVII – першай паловы XVIII стагоддзя. Пад яго пліткавай падлогай таксама знойдзены рэшткі заходняй сцяны, цаглянай падлогі і падмурак першапачатковай печы келлі сярэдзіны XVIII стагоддзя (мал. 9). Частка гэтых келляў была жылымі памяшканнямі, частка – склепамі. У пачатку XX стагоддзя цэнтральную частку будынка знеслі пры будаўніцтве кацельні і бойлернай [7, с. 4]. Над імі былі ўладкаваны санвузлы. Для гэтага ўся паўднёва-ўсходняя частка корпуса была перабудавана. Захаваліся толькі фрагменты сцен XVII – першай паловы XVIII стагоддзя на вышыню да 1,8 м. Пасля гэтага на іх рэштках пабудавалі вялікае памяшканне № 16 (гл. мал. 1, б), падлога якога з каляровых штампаваных квадратных плітак. Разбітыя скляпенні заменены бетоннай столлю на двухтаўравых швелерах. Падлогі некаторых памяшканняў былі пакрыты каляровай квадратнай штампаванай пліткай. З калідора будынка вялі высокія дзверы ў афіцэрскую сталовую, размешчаную таксама над кацельняй.




Мал. 9. Першапачатковыя цагляная падлога і падмурак печы XVIII стагоддзя

**Высновы.** Вывучэнне корпуса «В» дала багатыя і цікавыя звесткі па складанай будаўнічай гісторыі гэтага будынка, паколькі ён узводзіўся на рэштках больш старых пабудоў XVII – першай паловы XVIII стагоддзя. Дойлідам даводзілася вырашаць шмат складаных архітэктурна-канструктыўных задач па стварэнню з фрагментаў разных часоў больш-менш арганічнай пабудовы. Арыгінальныя канструкцыі давялося ўжываць і пры ўзвядзенні новых частак корпуса – гэта і замена часткі падмуркаў разгрузачнымі аркамі, і ўсталяванне сценаў на рэбры скляпенняў. Таксама зафіксаваны шырокі ўжытак лекальнай цэглы як канструктыўна-дэкаратыўнага элемента. Найбольшая колькасць выпадкаў яе ўжытку зафіксавана на фасадах корпуса. З гэтай цэглы быў выкананы міжпавярховы карніз і капітэлі руставаных пілястраў. Разам з тым побач з лекальнай фармаванай выкарыстоўвалася і лекальная часаная (са звычайных) цэгла. Гэта сведчыла аб недастатковых аб’ёмах вытворчасці фармаванай лекальнай цэглы.

Падчас даследаванняў будынка была сабрана вялікая калекцыя цэглы і дагэтуль невядомыя віды кафлі розных часоў. Падобнага комплексу будаўнічых матэрыялаў у Полацку пакуль не вядома.

Дзякуючы шматлікім пераробкам розных часоў корпус «В» стаў сапраўдным летапісам развіцця будаўнічых тэхналогій на працягу двух стагоддзяў. Менавіта тут удалося знайсці і даследаваць рэшткі каналізацыі і канструкцыі «цёплых падлогаў» XVIII стагоддзя. Таксама тут у пачатку XX стагоддзя былі ўпершыню ўладкаваны вадаправод, каналізацыя і дрэнаж сучаснага тыпу. Дарэчы, апошнія сталі часткай усёй разгалінаванай сістэмы падземных камунікацый кадэцкага корпуса, створанай у пачатку XX стагоддзя, і часткова працуюць нават сёння. Таксама тут было ўсталявана першае ў горадзе паравое ацяпленне і кацельня, атрыманы новыя звесткі па вонкавых фасадах будынка корпуса «В» – рэшткі прыбудоў, лесвіц розных часоў.

Дзякуючы гэтаму ўдалося ўдакладніць і часткова рэканструяваць першапачатковыя планіроўкі падвала і першага паверха. Вынікам гэтага з’яўляецца магчымасць удакладнення і функцыянальнай структуры і першапачатковага прызначэння некаторых памяшканняў.

На аснове знойдзеных матэрыялаў можна правесці спробу частковай графічнай рэканструкцыі магчымай першапачатковай планіроўкі падвала і першага паверха корпуса «В» у сярэдзіне XVIII стагоддзя (мал. 10).




Мал. 10. Магчымая першапачатковая планіроўка XVIII стагоддзя падвала (а) і першага паверха (б) па выніках натурных даследаванняў і планах 1828 года і пачатку XX стагоддзя (чорным колерам пазначаны рэшткі старадаўніх пабудоў)

ЛІТАРАТУРА

1. Кукуня, О. Объект: историко-культурная ценность изуитского коллегиума в г. Полоцке (Корп. «Б» и «В») Историко-архивные и библиографические исследования / О. Кукуня, В. Соболь. – Минск, 2001. – С. 1.
2. Салаўёў, А.А. Каменныя будынкі Полацкага езуіцкага калегіума падчас яго мадэрнізацыі / А.А. Салаўёў // Беларускае Падзвінне, методыка, вопыт і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у Полацку): зб. навук. прац рэсп. практ. семінара, Полацк, 20 – 21 лістап., 2008 г. / пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 70 – 79.
3. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI – XVII вв.: Архитектурно-археологический анализ / О.А. Трусов. – Минск: Наука и техника, 1988. – 160 с.
4. Салаўёў, А.А. Вынікі натурных даследаванняў на другім і трэццім паверхах корпуса «А» Полацкага езуіцкага калегіума падчас яго мадэрнізацыі / А.А. Салаўёў // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 2006 г.). – Полацк: НПГКМЗ, 2004. – С. 33 – 62.
5. Дэйніс, І.П. Полацкая даўніна / І.П. Дэйніс; уклад. і камент. М. Баўтовіча; пер. з ... мовы М. Ермалаева. – Мінск: Медисонт, 2007. – 330 с.
6. Археалогія Беларусі: у 4 т. / пад рэд. В.М. Ляўко [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 4: Помнікі XIV – XVIII стст. – 597 с.
7. Глинник, В.В. Архитектурный проект. Общая пояснительная записка. Раздел 1. Объект 06-98 ОПЗ / В.В. Глинник, В.Д. Старостин. – Минск, 2001.

*Паступіў 12.10.2009*

**PILOT EXPLORATION OF THE BASEMENT AND THE GROUNDFLOOR OF THE BUILDING «B» OF THE FORMER JESUIT COLLEGIUM IN POLOTSK**

*The article introduces the results of the pilot exploration of the basement and the groundfloor of the Building B of the former Jesuit Collegium in Polotsk. At the period of its modernization in 2006 – 2008 a big assemblage of archeological remains dating the second half of XVIII – the beginning of XIX centuries relating directly to the complicated history of the Building was collected. On the ground of the materials of pilot exploration of the walls and the vaults, an atempt of reconsruction of possible original appearance of its interiors, heaters and planning of the basement and the groudfloor.*